# СПЕКТАКЛЬ ДЛЯ ЖОНКІ



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

— ...А хто з нас хоць раз у жыцці не адчуваў сябе брыдкім качанём? Мы ўсе некуды не ўпісваемся, пакутуем ад таго, што «ўсе людзі, як людзі, а я быццам «белая варона». Прыкінуцца такім, як усе? — гэта самы проста шлях. А вось захаваць сваю «самасць», індывідуальнасць пад сілу далёка не кожнаму. У Андэрсена там усё добра заканчваецца. Брыдкае качаня ператвараецца ў прыгожага лебедзя. У жыцці ж усё, як правіла, больш складана...

У свой час Стас Сініца вучыўся на рэжысёра тэатра лялек. Нейкі час нават працаваў у тэатры. Цяпер жа прафесійна займаецца скульптурай і выкладае танга. А тэатр перайшоў у разрад хобі, якое прыносіць не столькі грошы, колькі маральнае задавальненне. Больш за ўсё яго душа ляжыць да не надта папулярнага ў нашай краіне, таямнічага ценявога жанру.

— Я з задавальненнем паказваю спектакль «Брыдкае птушаня» дзецям, бо мне хочацца, каб і сучаснае пакаленне дакранулася да таямніцы. Хочацца, каб ценявы тэатр жыў. Памятаю, калі да нас у школу прыехалі акцёры з шырмай ды праектарам і выключылі святло — я быў пад вялікім уражаннем. Для мяне гэта была нейкая магія, чараўніцтва. Потым, калі ўжо сам працаваў у тэатры «Зніч», мне на вочы трапіўся ролік: чалавек стаяў за шырмай і паказваў пры дапамозе рук усялякіх зайчыкаў, ваўкоў... Прычым яго рукі на экране выглядалі вялізнымі. І ўсё дзякуючы праекцыйнаму святлу.

Ценявая магія так захапіла Стаса, што ён пачаў паўсюль шукаць праекцыйны ліхтар. Але знайсці яго аказалася не так ужо і проста. У Беларусі ў адмысловых крамах пра такі нават і не чулі.

— Праз інтэрнэт даведаўся, што такі прыбор каштуе ажно паўтары тысячы еўра. У выніку я сам яго зрабіў. Узяў лінзу ад дзіцячага дыяпраектара, купіў магутны святлодыёдны ліхтар, злучыў іх і ў мяне атрымалася нядрэннае праекцыйнае святло.

Увесь ценявы спектакль «Брыдкае птушаня», ад пачатку і да канца, Стас прыдумаў сам. Выступіў і ў ролі мастака, і ў ролі гукарэжысёра. Але, каб паказаць тое, што атрымалася іншым людзям, яму патрэбны быў памочнік. Прапанаваў сыну паспрабаваць сябе ў ролі акцёра (Ілья вучыцца ў гімназіі-каледжы імя І. В. Ахрэмчыка, іграе на скрыпцы. — **Аўт.**) Той адразу ж пагадзіўся.

— Так атрымаўся сямейны тэатр, і я гэтаму вельмі рады, — усміхаецца Стас. — Мы з сынам працуем за шырмаю ў чатыры рукі. З правага боку ў строгай паслядоўнасці стаяць мае лялькі, з левага — Ілы. Рэпетуем дома. Балазе, зараз для гэтага ёсць усе ўмовы. Жывём у трохпакаёвай арэнднай кватэры. Адзін вялікі пакой адмыслова выдзелілі для творчасці. Там у нас стаіць шырма, праекцыйны прыбор. Паколькі я выконваю ролю не толькі рэжысёра, але і акцёра — знаходжуся ўнутры спектакля — то мы ўсе свае рэпетыцыі здымалі на відэакамеру. Пасля праглядалі, што атрымалася, і рабілі работу над памылкамі.

Тацццяна вельмі ўзрадавалася, што муж падключыў сына да свайго тэатральнага праекта.

— З аднаго боку цудоўна, калі ўсе ў сям'і маюць свае захапленні, — тлумачыць Стас. — Але тут ёсць і мінусы. Сын у нас музыка. Дома ў яго ёсць фартэпіяна, скрыпка, акулеля, губны гармонік... Можна наогул не выходзіць з пакоя, зрабіць сабе там музычную гасцініцу. Я займаюся танга, лялькамі, скульптурай. У мяне таксама цэлы пакой інтарэсаў. І ў жонкі тая ж сітуацыя. Таня кандыдат псіхалагічных навук, выкладае ў БДУ. Акрамя таго, займаецца рознымі сацыяльнымі праектамі, у асноўным звязанымі з дзеткамі-інвалідамі. Атрымліваецца, сядзіць кожны ў сваёй «норцы», захапляецца сваімі справамі. У нейкі момант мы адчулі, што гэта не зусім здарова. Не толькі ж за кухонным сталом сустракацца. Ценявы тэатр моцна згарманізаваў нашы з сынам адносіны. Падчас спектакля мы выступаем у ролі раўнапраўных партнёраў. Рэпетуем, потым разам праглядаем відэа, абмяркоўваем, раблю яму заўвагі, ён — мне. Дарэчы, многія парады Ільі я выкарыстаў у спектаклі. Прычым сямейны тэатр зблізіў не толькі нас з сынам, але і ўсіх нашых сваякоў і сяброў. Мы неяк паспрабавалі паказаць гэты спектакль гасцям, якія сабраліся на дзень нараджэння. Спачатку было традыцыйнае застолле, віншаванні, тосты, конкурсы. Пасля народ перамясціўся ў іншы пакой. Мы патушылі святло, і паказалі «Брыдкае птушаня». Гэта быў самы лепшы паказ, бо камернасць і ценявы тэатр створаны адно для аднаго.

Тацццяна, якой прысвечаны спектакль, падтрымлівае сваіх любімых акцёраў, стараецца наведваць усе іх паказы. А нядаўна Стас падключыў жонку ў якасці актрысы да сваёй чарговай задумкі.

— Мы з Таняй ужо даўно займаемся танга, — распавядае Стас. — Дык вось там час ад часу ладзяцца мілонгі — танцавальныя вечары. На адным з іх мы разыгралі невялічкі лялечны спектакль «Танга пад дажджом». Таня сыграла ролю бабулі, я — дзядулі. У нас быў стол, які круціўся. У дзядулі быў парасон. І яны танцавалі пяшчотнае танга пад гукі дажджу.

Для ценявога тэатра ў Стаса яшчэ шмат ідэй. У прыватнасці, ён хоча зрабіць пастаноўку па матывах «Русалачкі» Андэрсена. Але самая вялікая яго мара, каб ценявыя спектаклі падняліся на вялікую сцэну.

— Я прапаноўваў прафесійным тэатрам сваё «Брыдкае птушаня». Але яны, на жаль, настроены на камерцыю і на тое, каб спектакль можна было вывозіць. А ценявая пастаноўка нязручная ў гэтым сэнсе.

Разам з тым сям'ю Сініцаў рэгулярна запрашаюць на дзіцячыя камерныя фестывалі. Таму сачыце за анонсамі на старонцы тэатральнага калектыву ParadoxPinoccio ў «Фэйсбуку».

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**



## ЯК ЗРАБІЦЬ СВОЙ ДАМАШНІ ЦЕНЯВЫ ТЭАТР

«Выключыце ў доме святло, — праводзіць майстар-клас Стас Сініца. — Вазьміце мабільны тэлефон (а яны ва ўсіх цяпер якасныя) і актывізуйце ў ім ліхтарык. Гэта будзе тое праекцыйнае святло, якое я так доўга шукаў і не мог знайсці. Пасвяціце ліхтарыкам на сцяну. Прычым яна нават не абавязкова павінна быць белая, падыдзе і ружовая, і зялёная. Галоўнае, каб не чорная. Калі ёсць падстаўка для смартфона, шыкоўна. Калі няма, не бяда. У інтэрнэце вы знойдзеце мора варыянтаў, як яе зрабіць сваімі рукамі (напрыклад, з дроту ці кардоннага рулончыка ад туалетнай паперы).

Для пачатку раю ўзяць самую простую казку, напрыклад «Курачку Рабу». «Жыла-была курачка Раба. Ну, хто ў нас Раба? І пайшла курачка: «Ко-ко-ко». Сышла курачка Раба: «Ко-ко-ко». З'явіліся дзед і баба...» Сюжэт можна трансфармаваць, выдумляць на хаду. Увесь фокус у фантазіі. Такую казку дзеткам бацькі могуць расказваць у цемры перад сном. Таксама гэта можа быць цудоўнай забаўкай на дзіцячым дні нараджэння. Лялькі для ценявога спектакля лепш падрыхтаваць загадзя. Іх можна намаляваць на звычайным кардоне. Калі вы дрэнна малюеце, раздрукуйце карцінку з інтэрнэту і выражце па контуры. Каб неяк задзейнічаць дзяцей, прапануйце ім прыклеіць кардонных герояў да драўляных палачкі для сушы.

Можна абагаціць сваё прадстаўленне пры дапамозе дадатковага звычайнага ліхтарыка. Дайце яго камусьці з дзетак замест лялькі. І прапануйце яму быць сонейкам, зорачкай ці сонечным зайчыкам. Тады казку можна пачаць так. «...Сонца ўсходзіць (дзіця ўнутры светлавога круга робіць адну светлавую пляму ліхтарыкам) ...Сонца ўстала. І тут выйшла курачка Раба: «Ко-ко-ко...»

■ Нататкі таткі

# НЕ БОЙЦЕСЯ ЖАРТАВАЦЬ... ПЕРАД УГД

**Знаёмцеся: у адной з самых любімых рубрык «Сямейнай газеты» — новы аўтар. Гэтым разам шматдзетны. Павел ХОЛАД жыве разам з жонкай, сынам, дочкамі ды кошкай Шэры ў Заслаўі. Працуе ў беларускім офісе Міжнароднай арганізацыі па міграцыі. Калі выпадае вольны час, ахвотна займаецца баявымі адзінаборствамі і гуляе ў футбол.**



**Галоўнае багацце Паўла — дзеці. Іх у яго ажно пяцёра. Старэйшаму Арсеню — 15 гадоў, Марце — 13, двайняткам Веры ды Полі — па 7. Самай малодшай — Ксеніі — споўніўся годзік. Свае дасціпныя назіранні за малымі і іх арыгінальныя выказванні тата на працягу некалькіх гадоў запісваў у выглядзе фэйсбук-дзённіка (праўда, зусім нядаўна, ён выдаліў сваю старонку з сацсетак, маўляў, адымаюць шмат часу). Тым не менш гумарыстычныя і адначасова філасофскія нататкі Паўла Холада пад назвай «Запіскі шматдзетнага бацькі» ў трох тамах, пры жаданні, можна набыць у «Акадэмкнізе». Мы ж будзем друкаваць самыя цікавыя з іх (у тым ліку і новыя, бо Павел працягвае весці папяровы дзённік) на старонках газеты. Спадзяёмся, яны не толькі падымуць настрой нашым чытачам, але і натхняць іншых татаў ды мам занатоўваць перлы сваіх дзетак.**

...

Памятаю, калі ішлі на першае УГД, жартам сказаў жонцы: «Хлопчык ужо быў, дзяўчынка таксама, цяпер не так цікава — будзе альбо тое, альбо другое». Але, відаць, дзесьці наверсе мой жарт ацанілі і ў сваю чаргу таксама вырашылі пажартаваць.

Таму, калі доктар спытала: «А вы ў курсе, што ў вас двойня?» — у мяне проста адняло мову. У той момант, скажу шчыра, было зусім не да смеху. Ці жарт, колькасць дзяцей павялічваецца ўдвая! Але цяпер рады, вядома.

Так што мая вам парада: не бойцеся жартаваць перад УГД, потым самі радыя будзеце.

...

**Уся праўда пра жаночыя дыеты ад маіх двайнятак. Пасля вячэры Вера: «Поля, будзеш цукерку?» Поля абурана (макаючы блінчык у варэнне): «Ты што, не бачыш? Я худзею!» Вера пакрыўджана (засоўваючы ў рот арэх): «Наогул я таксама!»**

**Гэта была рубрыка «худзеем разам».**

...

Едзем у машыне, старэйшыя дзеці планамерна спрабуюць давесці мяне да кіпення. Дзесяць хвілін мужна трываю, пасля чаго не вытрымліваю і шчыра папярэджваю:

— Вы зараз у адным кроку ад таго, каб пасадзіць мяне на каня. Потым наракайце на сябе.

Малодшыя здзіўлена:

— Тата, ты хочаш сесці на каня?!

— Не хачу, але хутка сяду.

— Ура! Мы едзем катацца на коніках!

...

**Дэнамінацыя ўдарыла па кішэні: дзеці чамусьці вырашылі, што ўсе манеты, якія з'яўляюцца ў доме, аўтаматычна належаць ім, і мне не ўдалося пераканаць іх у адваротным. А манеткі гэтыя не такія танныя, а дзяцей як бы чацвёра (на той момант. — Рэд.).**

**Калі я паспрабаваў намякнуць, што больш манет не дам, яны пачалі мяне пераследаваць і сароміць: маўляў, тата, табе што, шкада манетак для любімых дачок? Ну як тут адмовіш? А хлусіць, што ў мяне іх няма, я не магу. Адзінае выйсце: прасіць у краме не даваць рэшту манетамі — інакш з торбамі пойдзем па свеце.**

...

Збіраюся на трэніроўку (адпачынак у мяне, калі што). Старэйшая дачка:

— Акуратней, тата, не зламай там нос.

На ўсялякі выпадак удакладняю:

— Сабе ці іншым?

Падумала і кажа:

— Ну хоць бы сабе.

Правільна, пра іншых няхай іх дочкі дбаюць.